**Святаслаў Валасюк**
**Брэсцкі політэхнічны інстытут**

# Трансгранічныя аспекты стварэння экалагічнага калідору ракі Заходні Буг.

Свядомасць згубнасці далейшае безагляднай эксплуатацыі прыродных рэсурсаў і спажывецкага падыходу да натуральнага асяроддзя спрычыніліся да паўстання моцнага праэкалагічнага руху ў Еўропе і ў свеце, а таксама да экалагізацыі палітыкі гаспадарчага і культурнага развіцця. Гэтая тэндэнцыя адбілася на паўстанні ў 1992 годзе Рыё-дэ-Жанэйрскай дэкларацыі па навакольным асяроддзі й развіцці, а таксама Агульнаеўрапейскай стратэгіі ў галіне разнастайнасці біятычнай і краявідаў 1995 г. (т.зв. Сафійскія прынцыпы). Важкае месца ў гэтых дакументах надаецца паўстанню нацыянальных экалагічных сетак, інтэграваных у агульнаеўрапейскія NATURA 2000 і ECONET. Асновай экасетак павінны стаць ахоўныя тэрыторыі, што захавалі багацце і разнастайнасць экасістэм, гатункаў і ландшафтаў. Натуральнаму калідору ракі Буг тут надаецца ключавое значэнне.

Экалагічныя вартасці Прыбужжа бясспрэчныя. Тут, у адрозненні ад Заходняй Еўропы збольшага захаваліся натуральныя рысы гідралагічнага рэжыму, краявідаў, флоры й фаўны, сярод якіх некалькі дзесяткаў гатункаў занесеныя да Чырвоных кніг а паасобныя, як, напрыклад балотная чарапаха маюць астатнюю ў Еўропе папуляцыю. Натуральным працягам Прыбужжа з'ўляецца Белавежская Пушча, найвялікшы ў Еўропе дзікі лес. Нізкаэкалагічны характар прамысловасці, сельскай гаспадаркі і транспарту прыбужскіх краінаў часткова кампенсаваўся паграцічным рэжымам ракі Буг, што абмяжоўвала ягоную гаспадарчую эксплуатацыю, а значыць, і шкодны антрапагенны ўплыў на экасістэмы.

Адметнасць працы па захаванні скарбаў Прыбужжа надаюць два наступныя аспекты.

- трансгранічны характар ракі Буг і натуральных вартасцяў Прыбужжа, які вымагае трансгранічнай каардынацыі дзеянняў, а ў ідэале — стварэння агульнарэгіянальнай стратэгіі прыродакарыстання і аховы прыроды, якая, паводле Мадрыдзкай Рамачнай Канвенцыі 1980 году, з'ўляецца адным з прыярытэтаў трансгранічнага супрацоўніцтва паміж лакальнымі ўладамі й супольнасцямі. Трэба адзначыць, што падобны дакумент існуе з 1997 году — Экалагічная Палітыка Еўрарэгіёну Буг. Але, на нашую думку, ён надалей вымагае напаўнення практычным зместам;
- пераходны характар эканомікі прыбужскіх краінаў. З аднаго боку, ва ўмовах трансфармацыі часцяком экалагічныя пытанні адсоўваюцца ўбок. Гэтаксама, у масавай свядомасці распаўсюджаны стэрэатып рынкавай эканомікі,

як сістэмы, якою рухае толькі матэрыяльны прыбытак, а таму сацыяльныя і экалагічныя праблемы ў ёй невырашальныя. І, хаця, галіна аховы прыроды краінаў з пераходнай эканомікай сапраўды адчувае дэфіцыт такіх неабходных інвестыцыяў, рэальнае ўвядзенне рынкавых механізмаў у прырода- і рэсурсакарыстанне, павіннае, паводле прынятай на Люцэрнскай Канферэнцыі Міністраў прыродных рэсурсаў 1994 году Праграмы дзеянняў па ахове навакольнага асяроддзя для Цэнтральнай і Усходняй Еўропы палепшыць экалагічную сітуацыю, мінімізаваўшы шкодны ўплыў гаспадарчай дзейнасці на прыродныя супольнасці.

Хаця візіі трох краінаў Прыбужжа на экалагічную будучыню рэгіёну грунтуюцца на агульных падыходах, аднак мае сэнс прааналізаваць іх больш дэталёва.

Сярод трох Прыбужскіх краінаў Польшча з'яўляецца своеасаблівым лакаматывам экалагічнай кааперацыі. Ейныя падыходы да ідэі экакалідору адметныя ў наступным:

- Польскую частку калідору складаюць ейныя ўсходнія рэгіёны — Любельшчына ды Падляшша — тэрыторыі з вялікай удзельнай вагой сельскай гаспадаркі, якія, паводле асобных падлікаў з'яўляюцца аднымі з найбяднейшых у краіне. Гэта вымагае пошуку новых крыніц даходнасці;
- Вялікі ўзровень беспрацоўя, які да таго ж падскочыў напачатку б.г. з 16 да 20% вымагае структурнай перабудовы гаспадаркі рэгіёну;
- Рэгіён валодае найлепшымі рэкрэацыйнымі рэсурсамі ў краіне — якія пры наяўнасці адпаведнай інфраструктуры і палітыкі, а таксама кампаніі прасоўвання здолелі б прыцягнуць вялікія масы турыстаў, зацікаўленых у першую чаргу непаўторнай прыродай і этнаграфіяй рэгіёну;
- Адміністрацыйная рэформа 1999 году дазваляе мабілізаваць мясцовыя супольнасці да вырашэння іхных праблем, дзякуючы прынцыпу субсідыярнасці, а таксама ўхваляць стратэгічныя рашэнні, забяспечаныя матэрыяльнымі сродкамі на ўзроўні тэрытарыяльных адзінак. Прыкладам можа служаць новаўтвораны саюз прыбужскіх паветаў і гмін з цэнтральным бюро ва Ўладаве;
- Традыцыйна моцныя недзяржаўныя арганізацыі, засяроджаныя на вырашэнні сацыяльных і экалагічных праблем лакальных супольнасцяў. Роля падобных утварэнняў у экалагічнай палітыцы падкрэсліваецца Кіруючымі Прынцыпамі Комплекснага Кіравання Прыродаахоўчай Дзейнасцяй — кіруючым дакументам Еўракамісіі ААН;
- Станоўчы вопыт супрацоўніцтва з Еўрапейскімі структурамі, які ў гэтым годзе ўвасобіўся ў выдачы найвялікшага транша PHARE для Польшчы за ўсю гісторыю гэтай арганізацыі.

Таму ў Польшчы існуюць усе передумовы, каб, інвэстуючы ў прыродную і культурную спадчыну Прыбужжа, праграмы развіцця эка- і агратурызму, атрымліваць прыбыткі, дастатковыя для ўтрымання і аховы натуральных

супольнасцяў, а таксама стварыць новыя працоўныя месцы, рэдукаваць шкодны уплыў экстэнсіўнай сельскай гаспадаркі на прыроду і здароўе людзей, правесці структурную перабудову эканомікі Любельшчыны і Падляшша. Лясы й паплавы Прыбужа будуць утрымліваць не толькі сябе, але і значную частку ўсяго рэгіёну.

Пазыцыя Украіны вельмі падобная да польскае. Вялікая ўвага Украінскім бокам надаецца развіццю ахоўных прыродных тэрыторыяў трансгранічнага характару — сумесна з Польшчаю, Румыніяй, Вугоршчынай, Славаччынай. Характэрна, што ў сваім выступе на Канферэнцыі “Буг — Еўрапейскі экалагічны калідор” у Любліне ў сакавіку бягучага году Др. Таццяна Анрэенко, дзеяч Украінскай Акадэміі Навук ды Дзяржкамітэту прыродных рэсурсаў выказала поўную гатовасць Украінскага боку да супрацоўніцтва па гэтай праграме. Першым крокам стане турыстычны пераход паміж Польшчай ды Украінай у раёне Уладавы. Немалая ўвага на Украіне аддаецца развіццю эка- і агратурызму — адпаведная спэцыяльнасць дзейнічае, у прыватнасці, ва Львоўскім універсітэце імя І.Франка. Хаця, трэба адзначыць, што Украіна знаходзіцца ў параўнанні з Польшчаю ў нашмат горшых эканамічных варунках, што не можа не адбіцца на ступені ейнага ўдзелу ў праекце.

Што тычыцца Беларускага боку, ягоная пазыцыя таксама прынцыпова ня розніцца ад пазыцыяў двух астатніх партнэраў. Пэўныя напрацоўкі па трансгранічных ахоўных тэрыторыях на прыкладзе Белавежскай Пушчы існуюць дастаткова даўно, ужо некалькі год органамі аховы прыроды вобласці прамуецца ідэя стварэння заказніка Бугскі ў раёне старарэчышча Буга, а таксама надання ахоўнага статуса азёрнаму колу, што месціцца на поўдні Брэсцкага раёну і прымыкае да Шацкага нацыянальнага парку Украіны.

Аднак, што пацвярджае і выступ спецыяліста Мінпрыроды З.Ф. Мураўёва на памянёнай Люблінскай сустрэчы, стварэнню беларускай часткі экакалідору замінаюць наступныя фактары:

- адсутнасць досведу працы з экалагічнымі калідорамі;
- экакалідор Буг не прадугледжаны Схемай арганізацыі ахоўных тэрыторыяў РБ да 2005 году;
- брак фінансавых сродкаў.

У выніку, да пытання стварэння экакалідору Буг у Беларусі вырашана вярнуцца ўвосень.